№4

# ТЕТРАДЬ

Успаміны Ю. Бібіла

Ins. "Б-ки

Бел.-укр. сувязі.

# Выстаўкі ў Маскве

У 20-ыя гады Дзяржаўная Бібліятэка БССР з'яўлялася адзіным асяродкам, дзе спецыяльна збіраліся і апрацоўваліся кніжныя матэрыялы па вывучэнню краю. Пра гэта ведалі і працаўнікі культуры і дзяржаўныя дзеячы. А таму, калі патрабавалася дзе небудзь паказаць краязнаўчую літаратуру пра Беларусь, даручалася Дзяржаўнай Бібліятэцы.

Успамінаецца некалькі такіх „выхадаў у людзі", дзе мне давялося прымаць непасрэдны ўдзел.

x) У 1924 годзе (9-14 снежня) адбывалася ў Маскве канферэнцыя па краязнаўству. Беларускаму аддзелу Бібліятэкі было даручана падабраць адпаведныя кнігі, якія паказвалі б, што Беларусь гэта не проста геаграфічная назва, а краіна са сваёй складанай гісторыяй і культурай. З ~~[illegible]~~ дэлегатаў на канферэнцыю памятаю В. Самцэвіча з Барысава і М. Каспяровіча з Цэнтральнага бюро краязнаўства (Мінск).

---

x) „Дневник 2-ой Всес. конфер. по краеведению 9-14 дек. Москва. М. [1924]-1925, №№ 1-4 (Центр. бюро краеведения при Рос. Акад. наук)."

Кнігі ў Б-цы няма

Кнігі, якія я прывезла з Мінска, пастаралася перадаць бібліятэкарам, што ладзілі выстаўку да Канферэнцыі. Са мною быў М. Каспяровіч. У памяці засталася вельмі гарачая спрэчка з дасведчанымі бібліятэчнымі зубрамі, якім цяжка было пераламаць свае зняважлівыя адносіны да нейкіх беларусаў. З чаго пачалося – ці ўспомніш? Хваліцца нам не вельмі было чым, апроч маладосці, але і зняваг ~~зна-~~ ~~[illegible]~~ дараваць немагчыма. З гэтай палымянай дыскусіі паўстаюць у памяці два імя: Пушкін і Купала. Так з імем Купалы мы і рынуліся ў гарачы бой.

Шмат цікавага было на Канферэнцыі. Сярод народаў-удзельнікаў мы адчувалі сябе не горшымі за іншых.

---

У лютым месяцы 1927 годзе ў Маскве адбылася 3-яя сесія ЦВК СССР, дзе была заслухана справаздача Урада БССР. З дакладам выступаў старшыня Саўнаркома БССР Я. Адамовіч, а таксама старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў. Дзяржаўнай бібліятэцы даручана было наладзіць на Сесіі выстаўку беларускага друку. На дзесятым годзе Кастрычніка ўжо можна было што паказаць.

Выстаўка змяшчалася ў Георгіеўскай зале Крамлёўскага палаца. Высокія сцены з прозвішчамі загінуўшых „георгіеўскіх кавалераў". Дужна высяцца з бакоў калоны. Зяе пазалота, пераліваецца крышталь ў вялізных люстрах. Пры ўваходзе яскрава чырвоная стужка з надпісам: „Беларуская савецкая сацыялістычная рэспубліка" Апроч літаратуры, паказаны дыяграмы, фатаграфіі меліярацыйных работ, вялікая карта Савецкай Беларусі. Асобны кіёск Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі, дзе можна было набыць патрэбныя кнігі.

*) Ці не быў гэта В. К. Бялыніцкі-
Біруля?

Пасяджэнні Сесіі адбываліся ў Андрэеўскай залі, а ў перапынках дэлегаты запаўнялі Георгіеўскую залу і многія знаёміліся з выстаўкай, задавалі шмат пытанняў. Непасрэдныя ўражанні перадаюцца ў маім артыкуле „Беларусь у Крамлі. (Уражанні)", є змешчаным у газеце „Савецкая Беларусь (1927, №50 2-га сакавіка, подпіс: Б-о)

У артыкуле ўспамінаецца пажылы наведвальнік мастак (на жаль, прозвішча яго не названа), які з пачуццём гаварыў: „Я люблю сваю краіну і пакуль жыў хацеў бы хоць чым небудзь быць ёй карысным. Я зраблю падарожжа па Беларусі і зарысую яе краявіды — можа мая праца прыдасца." Пісаў пра выстаўку і М. Чарот (яго я бачыла на Сесіі) у газеце „Савецкая Беларусь" „З III-яй сесіі ЦВК СССР (На беларускай кніжнай выстаўцы)" (1927, №45 24 лютага, подпіс: М.Ч.)

У час. „Чырвоны сейбіт" (1927, №10-11, с.7) змешчана нататка „Беларуская кніжная выстаўка

у Крамлі" і вельмі невыразная фатаграфія. Шкада, што ў Бібліятэцы не захавалася вялікая, выразная фатаграфія, якую я прывезла з Масквы.

Я спынілася ў Беларускім прадстаўніцтве на Малай Нікіцкай. У Крэмль можна было трапіць па пропуску. Мяне кожны дзень адвозілі на машыне, і шафёр у „Спаскіх" варотах паказваў варце пропуск.

---

У студзені 1931 годзе Масква знаёмілася з дасягненнямі сацыялістычнага будаўніцтва БССР. [Пра гэтыя „Дні беларускай культуры" успамінае Мазалькоў у газ. „Літаратура і мастацтва" за 5 снежня 1968 г.]. Беларуская дэлегацыя ў складзе прадстаўнікоў розных галін гаспадаркі і культуры наведала шмат якія установы, была на прыёме ў М. І. Калініна. У Палітэхнічным музеі адчынілася выстаўка, дзе дэманстраваліся ўзоры вырабаў рэспублікі, дыяграмы, фатаграфіі, кнігі. Выстаўка размясцілася ў фаэ памяшканні тэатра з незвычайнай назвай „Сэмперантэ" (заўсёды наперад). Удзень бывала няшмат наведвальнікаў, затое яны шмат чым цікавіліся, увечары тэатр запаўняўся гледачамі, і на пераменках рабілася шумна. На выстаўцы, апрача мяне, быў прадстаўнік ад Наркамасветы і Наркамзема.

Мне ўдалося пабываць разам з бела-

рускай дэлегацыяй на прыёме ў М.І. Калініна
Прыёмная змяшчалася на Краснай плошчы
супраць Крамля. Вітаў М.І. Калініна Чар-
нушэвіч (з Наркамасветы). У час прывітання
М.І. Калінін неяк неспакойна паводзіў
сябе – відаць, ему не падабаліся ўслаўленні.
Нарэшце ён не вытрымаў і сказаў:
„Вядома, мы з вамі рады спаткацца, але
давайце гаварыць пра тое, што ў каго баліць"

---

Першы з'езд пісьменнікаў Саюза ССР.
Парк культуры і адпачынку імя М. Горкага.
У павільёнах людзілася выстаўка літаратур
народаў Саюза. Навокал кветкі, кветкі — пах ляўкоеў, а ў вячэрнім змроку белыя пахучыя зоркі тытуню. Тонкі водар кружыць галаву. У тыя часы мы мала дзе іх бачылі, а тут іх дывана.

Для беларускай літаратуры падрыхтаваны стэнд, на якім мастак намаляваў жанчыну ў жабрачай світцы. Сучасную Беларусь у такім вобразе нельга было прыняць. Давялося на падмогу ў якасці арбітраў паклікаць прадстаўнікоў з Беларускага прадстаўніцтва пры Урадзе СССР. Быў сярод іх ~~[illegible]~~ і Мельнік (раней ён працаваў у прадстаўніцкай асвеце)

Кнігі пісьменнікаў для выстаўкі ўважліва падбіраліся — і старэйшых і маладых. Я не чакала адчынення з'езду і, перадаўшы кнігі, выехала. Кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў намагалася пакінуць нашы кнігі ў сваёй бібліятэцы ~~Саюза пісьменнікаў~~.
І доўга адміністрацыя Дзяржаўнай бібліятэкі

вяла перапіску, патрабуючы зварот[у],
бо гэта былі экземпляры з фондаў бібліятэкі.

# Клептаман у бібліятэцы.

Усялякія прыгоды бываюць у жыцці, а ў бібліятэцы здараюцца і такія, аб якіх будзе гутарка ніжэй.

Гэта было ў 1929-1930 годзе — дакладна не памятаю. У галоўным будынку бібліятэкі (т. зв. „юбілейным" доме) папсавалася цэнтральнае ацяпленне. Зіма. У агульнай чытальнай зале яшчэ сяк-так можна было працаваць — народу шмат, сядзелі, укутаўшыся ў кажухі, абагравалі сваім цяплом. А ў беларускім аддзеле, што знаходзіўся насупраць, было горш. Студэнты сюды звярталіся толькі за даведкамі, а навуковыя працаўнікі прыходзілі зірнуць на новыя атрыманні бібліятэкі, якія былі тут раскладзены на сталах, і доўга не затрымліваліся. Печка „буржуйка" ужо даўно закончыла сваё слаўнае існаванне, толькі след сажы знадворку доўга напамінаў пра мінулае. Нас працавала двое, і мы ўмовіліся не часта бегаць грэцца ў канцылярыю,

Книжі у Б-ця нема. Треба було б
нагадувати [illegible].

што змяшчалася ў будынку на рагу вуліцы Чырвонаармейскай.

Неяк дырэктар прывёў у аддзел чалавека з абшарпаным партфелем, не вельмі элегантна апранутага і адрэкамендаваў яго як знаўцу старажытных моў і аматара старадрукаў. Выгляд яго адпавядаў яго спецыяльнасці. Дырэктар дазволіў яму карыстацца старадрукамі, якія знаходзіліся ў аддзеле. Яны змяшчаліся ў невялікім пакойчыку за фанернай загародкай.

Прайшло некалькі дзён. У сваё дзяжурства я не спатыкала гэтага чытача. Пытаюся ў супрацоўніка (Мількевіча), ці бывае гэты знаўца. Ён кажа, што наведвае, але не затрымліваецца. Я вырашыла праверыць, у якім стане знаходзяцца кнігі, якія прагледзеў чытач. Можна паблытаў — думаю. І вось... ледзь не звалілася з драбіны так усхвалявалася! Там, дзе павінен стаяць кантоўскі рукапіс (XIV ці XV стагоддзя не памятаю ўжо), апісаны ў кнізе: В.Н. Перетц „Рукописи библиотеки Московского университета, Самарской библиотеки и музея и мелких собраний" (Л., 1934),

стаяла толькі абцягнутая скурай драўляная вокладка. Ліхаманкава перабіраю іншыя каштоўныя кнігі, але ці ж адразу выявіш, што якіх згінула?

Трэба зазначыць, што ў той час пры выхадзе кантролю не было, і чытачы праходзілі з партфелямі.

А вось і чытач — лёгкі на ўспаміні! Проста накіроўваецца да паліц, але я спыняю яго, прапаную сесці за стол і падаю яму кнігі. Ён трохі бянтэжыцца, але садзіцца і скоса на мяне пазірае, няўважліва разглядаючы пададзеныя кнігі.

На змену мне прыйшоў супрацоўнік, але я заставаўся чакаць, калі гэты „аматар“ збярэцца выходзіць.

Калі ён нарэшце выйшаў за дзверы, я — за ім. Мне не хацелася падымаць гутарку ў прысутнасці супрацоўніка.

— Аддайце рукапіс! — кажу.

— Вы гэта што? Што за абраза! Злодзей!

— Аддайце рукапіс! А не... так пойдзем да дырэктара! Ідзіце наперад!

Відаць, мой выгляд быў такі ўзрушаны, а ў голасе столькі злосці і металу, што ён насцярожыўся і пакорліва пакрочыў уперадзе.

Спускаемся па сходах, затым па адзінай сцежцы да Чырвонаармейскай вуліцы. Бачу на рагу міліцыянера.

— Вось паклічу міліцыянера, няхай ён разбярэцца!

— Не трэба! Не трэба! — просіць, аж рукі зчапіўшы і губы задрыжэлі. — Я — клептаман, лячуся ў Маскве ў прафесара. Магу яго адрас паведаміць. Даруйце!

— Злодзей вы і нягоднік! Ідзіце да хаты!

Пайшлі. Ён наперадзе, я — ззаду. Жыў ён недзе каля вакзала.

Рукапіс быў знойдзены і яшчэ пачка кніг не толькі з аддзела, але і з неразабранай кучы, што ляжала ў калідоры побач з канцылярыяй.

Дацягнуў мне гэты незадачлівы „спец" дамоў цяжкую пачку да трамвая і ўсё прасіў, каб я не паведамляла міліцыі.

Аб гэтым здарэнні так ніхто і не даведаўся. Мне не хацелася псаваць кроў нашаму даверліваму дырэктару.

Ю. Бібіла

---

Прамінула шмат гадоў. Калі У. Сіманоўскі рыхтаваўся пісаць гісторыю Бібліятэкі, і мы займаліся ўспамінамі, я падшукала яму гэтыя нататкі. Ён надта быў здзіўлены, яго вельмі ўразіла слова „даверлівы".

---

Арганізацыйныя поспехі Дзяржаўнай бібліятэкі і яе краязнаўчы фонд выклікалі зацікаўленасць працаўнікоў беларускай культуры. Дасягненні бібліятэкі радавалі, і за імі са спагадай сачылі і дзяржаўныя дзеячы. З цёплым пачуццём хочацца ўспомніць А. Р. Чарвякова, старшыню ЦВК БССР. Яму добра быў ведомы наш няўрымслівы, апантаны дырэктар, але ён ведаў і іншых працаўнікоў бібліятэкі. Так, у 1936 годзе, калі наведаў нашу рэспубліку старшыня ЦВК Башкірскай АССР, А. Р. Чарвякоў разам з ім прыйшоў у бібліятэку. Трэба было бачыць, з якім веданнем справы ён тлумачыў госцю ў беларускім аддзеле пра задачы аддзела і пачаў сам мяне адрэкамендаваў як самую „старую" працаўніцу бібліятэкі. Трэба ж было сярод паважных дзяржаўных спраў задавацца ў памяці такую дробязь!

[З вялікай цікавасцю і хваляваннем чытала артыкул У. Якубава пра А. Чарвякова („Полымя", 1971, №5). Ён напісаны не толькі на аснове сухіх дакументаў, але адчуваецца і цёплая нота людзей асабіста ведаўшых гэтага выдатнага чалавека.
І прыпомніўся мне трагічны дзень ліпеня 1937 года, калі абляцела трывожная вестка, што няма ўжо А. Чарвякова. Гроб з целам быў пастаўлены ў клубе савецкіх служачых, і пацягнуліся чэргі ўсхваляваных людзей, каб развітацца, але не ўсім удалося трапіць, бо праз некалькі гадзін доступ быў спынены. Не трапіла туды і я, але калі гроб правозілі па Лагойскаму (Бяздонсніка) завулку, каля нашага дома, на Вайсковыя могілкі, мы далучыліся да тых нямногіх, што праводзілі у апошні шлях такога вядомага чалавека. А душу ахапіла трывога].

падзяк і за „безупречную работу" і за „долголетнюю отличную работу в области краеведческой библиографии", „за активное участие в издательской деятельности библиотеки" і г. д.

У развітальным адрасе з прычыны майго выхаду на пенсію сказана:

„В Вашем лице библиотека имела библиографа высокой квалификации, автора многих содержательных и обширных библиографических указателей, особенно в области краеведческой библиографии, а наши читатели — внимательного и хорошо эрудированного помощника и советчика"

Калі зрабіць скідку на некаторую пафаснасць, якая вымагалася падзеяй, што адбывалася, усё ж нешта застанецца.

Вельмі расчуліла мяне прывітанне д-ра геаграфічных навук праф. Н. С. Фролова (ён, між іншым, у 20-ых гадах працаваў у Горы-Горках, а потым пераехаў у Саратаў). Ён пісаў, што часта карыстаўся маёй „компетентной помощью"... „Это дало мне возможность

оценить Ваше глубокое знание книжных фондов научной библиотеки, библиографии Саратова, Саратовской области и Нижнего Поволжья и многих других разделов книжных богатств и литературы таких районов нашей Родины как особо любимая Вами Белоруссия"

У мяне засталося задавальненне, што „не пасрамила" зямли беларускай, але і жаль, што — пры спрыяльных умовах — мая праца магла б даць нешта больш значнае для вывучэння роднай Беларусі.

Як справядліва адзначыў праф. Н. С. Фралоў, „особо любимая" Беларусь заставалася ўсе гады ў маім сэрцы, і я здалёк сачыла за трывожнымі падзеямі і пасляваенным будаўніцтвам. Вярнуцца на радзіму пасля вайны і ўключыцца ў працу мне перашкаджалі цяжкія сямейныя нягоды.

Са шкадаваннем успамінаю нашы страты і асабістыя лёсы людзей.

Горыч развітання з блізкай сэрцу працай увосень 1937 года. Зняліі з работы І. Сіманоўскага, я атрымала адстаўку як „несправившаяся" з работай. Скажу шчыра, што не заслужыла такой ацэнкі, бо не толькі працавала сумленна, але і аддана. і вынікі маёй працы сведчылі пра гэта

Хаця і крыўдна было, што мяне так кваліфікавалі, але прымаючы пад увагу агульную тагочасную сітуацыю, я разважала, што яшчэ добра абышлося, бо так лёгка было атрымаць які небудзь нечаканы „хвост". Я толькі сказала, што пастараюся ў іншым месцы ўсё ж справіцца з любой работай. І сваё абяцанне стрымала.

Цяжкі і трагічны гэта быў час. Я – нязначная адзінка сярод тых працаўнікоў беларускай культуры, якіх злая воля раскідала

па розных кутках. Хто ацалеў, стараўся „не пасраміць" зямлі беларускай. А колькі таленавітых не стала! Тыя часы чакаюць свайго ўдумлівага і справядлівага даследчыка.

З верасня 1937 года па лістапад 1959 года я працавала ў Навуковай бібліятэцы Саратаўскага ўніверсітэта. Я займалася блізкай мне краязнаўчай бібліяграфіяй, толькі трэба было нямала папрацаваць, каб пазнаёміцца з асаблівасцямі незнаёмага мне краю. Сабраны бібліяграфічны матэрыял удалося адфармiць на машынцы пад назвай „Материалы для библиографии Саратовской области" — вып. 1 (1947 г., 500 стар.), вып. 2 (1957 г., 470 стар.) і шэраг іншых. У супрацоўніцтве з іншымі бібліяграфамі прымала ўдзел у выданні серыі „Библиография Саратовской области" (География, Саратовской области, Глеба Паўночна-Усходняй часткі Еўрапейскай часткі СССР, Клімат і воды)

Нямала я атрымала розных адзнак

вопыту, галоўнае — энтузіязму і думак у Б-ку.

Прыпамінаю дзянькі 1941 год. Краіна стагнала пад ботам ворагаў. Вы ўвосень праехалі ў Саратаў. Вас ветліва і прыязна спаткалі ў Навуковай бібліятэцы Сарат. універсітэта. Вы маглі б там прабыць да дня вызвалення, але ўжо ўлетку 1942 года Вы не вытрымалі і паехалі ў ваенную Маскву і мне тлумачылі, што не можаце тут сядзець, бо трэба ехаць і адбіраць у Ленінскай бібліятэцы кнігі. Так Вы верылі ў перамогу! Невядома, што сталася з Беларускай бібліятэкай. Трэба рыхтавацца да звароту. Было гэта?

Вы скінулі са сваіх плеч цяжар адміністрацыйных клопатаў. Я веру, што ў Вас знойдуцца сілы на работу, якая не звязана з кіраўніцтвам. Ваш вопыт, эрудыцыя павінны быць выкарыстаны.

Не раз мне думалася, ці заўважалі Вы калі-небудзь сонца, дрэвы, кветкі? Няўжо толькі ў мудрых кнігах і друкаваных аркушах усё хараство жыцця?

Ці хоць раз вы глядзілі на неба, на кветкі не вачыма бібліятэкара?

Каб напомніць вам аб гэтым, вітаю вас кветкамі.

Пішыце вершы!

Прысутныя зноў рагаталі і смяяліся.

# Беларуска-ўкраінскія сувязі.

У канцы 20-х гадоў, праглядаючы ўкраінскі часопіс „Бібліологічні вісті", я зацікавілася бібліяграфіяй, надрукаванай Ю. Меженкам, пра пераклады беларускай мастацкай літаратуры на ўкраінскую мову. Са здзіўленнем я ўбачыла, што аўтар палічыў Крапіву і Крапіўку (Цётка) за адну і тую ж асобу. Паколькі ў канцы працы быў паказаны адрас, куды прасілі накіроўваць заўвагі, я неўзабаве напісала пра такое арыгінальнае спалучэнне. Так пачалося завочнае знаёмства з вядомым бібліёграфам, нястомным калекцыянерам, палымяным збіральнікам Шаўчэнкіяны — Юрыем Аляксеевічам Меженкам (1892-1969). Улетку 1930 года я асабіста з ім пазнаёмілася, а перапіска наша пасля доўгага перапынку ўзнавілася пасля вайны і працягвалася гадоў 20. (Памёр Ю. Меженко ў 1969 г. Некралог у газ. „Літ Україна" 1969 28/XI).

Сваю Шаўчэнкіяну, якую ён збіраў гадоў 50, перадаў Інстытуту літаратуры АН УССР. Вось у гэтай унікальнай калекцыі, якая налічвае да 15 тысячаў адзінак, ёсць і беларускія кроплі. У падзяку за дапамогу я атрымала ад Ю. Межэнка кнігу з надпісам: „Вельмишановній Юлії Йосипівні Бібіло з глибокою подякою за ласкаву допомогу в збіранні Шевченкіани", 1964.04.23.

---

Успамінаецца мне і камандыроўка ў Кіеў (зіма 1929 г.) (30 г.) для азнаямлення з працай Бібліятэкі АН УССР. Шмат убачыла я цікавага і карыснага. Пасля звароту зрабіла паведамленне аб сваіх уражаннях. На сходзе было вырашана пачаць соцспаборніцтва нашых бібліятэк, была ўложана ўмова і паслана ў Кіеў. Далейшы лёс нашага пачынання не захаваўся ў памяці. Відаць, падзеі 30-х гадоў не спрыялі развіццю больш блізкіх кантактаў.

Мая прамова на провадах І. Сіманоўскага на пенсію. Лета 1961 года (3-ці паверх, круглая зала на чырвонаарм. вул.)

Я задаволена, што мне давялося спаткацца з Вамі ў гэты ўрачысты дзень і хочацца прывітаць вас не толькі асабіста, але і ад іншых падобных мне мастадонтаў, якія пачыналі працаваць разам з Вамі ў далёкія гады. На ўрачыстых сходах — урачыстыя прамовы, але ў мяне не атрымаецца так.

Мы пачыналі працаваць на ніве для нас незнаёмай, а Вы шмат энергіі і цярплівасці ўклалі, каб навучыць нас, адчыніць перад намі бліскучыя перспектывы. Вы былі патрабавальным настаўнікам, аўтарытэтам для нас у гэтай справе, мы вам давяралі. Аднак Вашы навучэнцы, бывала, ўмелі выпускаць і вострыя кінцюры, нават балюча драпацца, але гэта не перашкаджала агульнай справе.

Вось тут мы сабраліся ў прыгожай,

светлай зале, а ўспамінце „юбілейны“? Фанерныя дзверы так званага Вашага кабінета, дзе вы рэдка калі сядзелі, „буржуйку“ сярод чытальні для навуковых працаўнікоў. У калі энтузіязм і агонь у душы мала нас грэлі ў нашых падрапаных паліто, гэта „буржуйка“ вельмі дапамагала скрозь зімовую завіруху бачыць і верыць, што прыйдзе вясна.

Вашы ідэі, Вашы „фантазіі“ захаплялі нас, яны былі перспектыўныя, абгрунтаваны.

За поспехамі бібліятэкі сачыла шмат прыхільнікаў як ва ўрадавых установах, сярод культурных працаўнікоў. Памятаеце У.І. Пічэту? Як ён прыхільна ставіўся да бібліятэкі! Калі б не было такіх адносін ~~да бібліятэкі~~, то ці быў бы збудаваны гэты гмах, у якім мы знаходзімся? І гэта ў тыя нялёгкія 30-ыя гады, калі ўся гаспадарка краіны перабудоўвалася! Хто не ведаў Вашага капелюша, бачыўшага шмат нягод, і паношанага партфеля? Ён вандраваў ад парога да парога і дабіваўся свайго.

Вы ўклалі шмат энергіі, багатага

Ў 1982 годзе я прыступілася на

# МЕТРИЧЕСКАЯ СИСТЕМА МЕР

## МЕРЫ ДЛИНЫ ИЛИ ЛИНЕЙНЫЕ

1 километр *(км)* = 1000 метров *(м)*
1 метр *(м)* = 10 *дм* = 100 сантиметрам *(см)*
1 дециметр *(дм)* = 10 сантиметрам *(см)*
1 сантиметр *(см)* = 10 миллиметрам *(мм)*

## МЕРЫ ПЛОЩАДИ

1 кв. километр *(кв. км)* = 1000000 квадратных метров *(кв. м)*
1 кв. метр *(кв. м)* = 100 квадратным дециметрам = 10000 кв. сантиметров *(кв. см)*
1 гектар *(га)* = 100 арам *(а)* = 10000 кв. *метров (кв. м)*
1 ар *(а)* = 100 кв. метрам *(кв. м)*

## МЕРЫ ВЕСА

1 тонна *(т)* = 1000 килограммов *(кг)*
1 центнер *(ц)* = 100 килограммам *(кг)*
1 килограмм *(кг)* = 1000 граммов *(г)*
1 грамм *(г)* = 1000 миллиграммов *(мг)*

## МЕРЫ ОБЪЕМА

1 куб. метр *(куб. м)* = 1000 куб. дециметров = 1000000 куб. сантиметров *(куб см)*
1 куб. дециметр *(куб. дм)* = 1000 куб. сантиметров *(куб. см)*
1 литр *(л)* = 1 куб. дециметру *(куб. дм)*
1 гектолитр *(гл)* = 100 литрам *(л)*

# ТАБЛИЦА УМНОЖЕНИЯ

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2 × 1 = 2 | 3 × 1 = 3 | 4 × 1 = 4 | 5 × 1 = 5 |
| 2 × 2 = 4 | 3 × 2 = 6 | 4 × 2 = 8 | 5 × 2 = 10 |
| 2 × 3 = 6 | 3 × 3 = 9 | 4 × 3 = 12 | 5 × 3 = 15 |
| 2 × 4 = 8 | 3 × 4 = 12 | 4 × 4 = 16 | 5 × 4 = 20 |
| 2 × 5 = 10 | 3 × 5 = 15 | 4 × 5 = 20 | 5 × 5 = 25 |
| 2 × 6 = 12 | 3 × 6 = 18 | 4 × 6 = 24 | 5 × 6 = 30 |
| 2 × 7 = 14 | 3 × 7 = 21 | 4 × 7 = 28 | 5 × 7 = 35 |
| 2 × 8 = 16 | 3 × 8 = 24 | 4 × 8 = 32 | 5 × 8 = 40 |
| 2 × 9 = 18 | 3 × 9 = 27 | 4 × 9 = 36 | 5 × 9 = 45 |
| 2 × 10 = 20 | 3 × 10 = 30 | 4 × 10 = 40 | 5 × 10 = 50 |
| 6 × 1 = 6 | 7 × 1 = 7 | 8 × 1 = 8 | 9 × 1 = 9 |
| 6 × 2 = 12 | 7 × 2 = 14 | 8 × 2 = 16 | 9 × 2 = 18 |
| 6 × 3 = 18 | 7 × 3 = 21 | 8 × 3 = 24 | 9 × 3 = 27 |
| 6 × 4 = 24 | 7 × 4 = 28 | 8 × 4 = 32 | 9 × 4 = 36 |
| 6 × 5 = 30 | 7 × 5 = 35 | 8 × 5 = 40 | 9 × 5 = 45 |
| 6 × 6 = 36 | 7 × 6 = 42 | 8 × 6 = 48 | 9 × 6 = 54 |
| 6 × 7 = 42 | 7 × 7 = 49 | 8 × 7 = 56 | 9 × 7 = 63 |
| 6 × 8 = 48 | 7 × 8 = 56 | 8 × 8 = 64 | 9 × 8 = 72 |
| 6 × 9 = 54 | 7 × 9 = 63 | 8 × 9 = 72 | 9 × 9 = 81 |
| 6 × 10 = 60 | 7 × 10 = 70 | 8 × 10 = 80 | 9 × 10 = 90 |

Целлюлозно-бумажный комбинат „Герой труда" г. Добруш, БССР.

Артикул 1080-БЛ | ГОСТ 12063-66 Сорт I | 1971 г. 1 квартал. | 12 листов. Цена 2 коп.



Национальная библиотека Беларуси
ЗОН//8038(026)

Мне запомнилось, что
Занимаясь серьезным чтением
литературы среди таких же, как
я сама, молодых студентов порой,
теперь уже не помню по како-
му поводу (раз-то был заснув-
ший за книгой студент) порой
неудержимо нападал смех,
с которым невозможно было бо-
роться. И чтобы не получить за-
мечания следившего за поряд-
ком библиотекаря, приходилось
на время покинуть зал, чтобы
высмеяться... *

* Недаром говорят, что глупости запоми-
наются

К 1-й стр.

да и подавление силой, т.е. исключение из демократии, эксплуататоров, угнетателей народа, - вот какова видоизменение демократии при переходе от капитализма к коммунизму"!

К проблеме демократии при капитализме и диктатуре пролетариата, широко освещенной в труде "Государство и революция", В.И.Ленин неоднократно возвращался в ряде своих последующих работ: "Очередные задачи Советской власти", "О "демократии" и диктатуре", в выступлениях на I конгрессе Коминтерна, в лекции "О государстве" в Свердловском университете и в других произведениях, вошедших в сборник ленинских работ "О советской социалистической демократии" (М., Госполитиздат, 1958. 112 стр.)

Высказывания В.И.Ленина о социалистической демократии, о путях и формах ее совершенствования, о вопросах государственного строительства, об участии трудящихся в управлении государством собраны также в его сборнике "О привлечении масс к управлении государством" (М., Госполитиздат, 1962. 292 стр.) В произведении "Удержат ли большевики государственную власть?", в "Речи на заседании Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов совместно с фронтовыми представителями 4(17) ноября 1917 года", в обращении "К населению", в проекте декрета о праве отзыва и в других ленинских работах, помещенных в этом сборнике, раскрываются преимущества Советов как новой высшей формы демократии, конкретные пути укрепления государственного аппарата и привлечения трудящихся к повседневной работе по управлению государством. В Советах В.И.Ленин видел аппарат, который в силу своей демократичности и неразрывной связи с массами способен действительно поднять массу к руководству государственными делами. Целый ряд документов сборника свидетельствуют о том, как Ленин на практике ставил вопросы об участии рабочих крестьян в органах государственной власти

В.И.Ленин придавал огромное значение правильному пониманию и безусловному претворению в жизнь социалистических принципов организац